**Занятак** па адукацыйнай галіне **“Дзіця і прырода”**
**“Прыйшла вясна, прыляцелі птушкі”**

**Праграмны змест:**

- ✓ фарміраваць уяўленні дзяцей аб прыкметах птушак як жывых істот: рухаюцца, кормяцца розным кормам, уюць гнёзды, адкладваюць яйкі, выводзяць птушанят;
- ✓ замацаваць веды аб гукавых сігналах птушак;
- ✓ развіваць пазнавальную актыўнасць, уменні звязнага, граматычна, правільнага і чыстага маўлення, уменне складаць апісальны расказ;
- ✓ выхоўваць адказнасць за стан птушак бліжэйшага акружэння, культуру маўленчых зносін.

Вых. Ці усе ёсць пытаю вас,
Пачынаю бо ужо ёсць час,
Ёсць тут я, ёсць і вы,
Раз, два, тры.
Давайце наладзім сабе добры настрой: усміхніцеся адзін аднаму, папляскайце ў далоні.З кім мы не павіталіся?

Дзеці. З гасцямі. Добры дзень!

В.Дзеці, ведаеце, калі я сёння прачнулася, то за акенцам пачула вясёлы перазвон птушынных галасоў. Птушкі весела і гучна спявалі свае песні. Па дарозе ў дзіцячы сад я таксама чула спевы птушак. Яшчэ зусім нядаўна было ціха, а зараз з усіх бакоў льецца іх вясёлы спеў. А што здарылася? А вы чулі спевы птушак?

Д.Наступіла вясна, растаў снег, стала цёпла і да нас вярнуліся птушкі.

В.Як называюцца птушкі, якія адлятаюць на зіму ў цёплыя краіны?

Д.Пералётныя.

В.А як называюцца птушкі, якія зімуюць з намі?

Д.Зімуючыя.
*Выходзяць дзеці і чытаюць верш ”Нашы птушкі” А.Гурло:*
У нашым краі – Беларусі –
Ёсць буслы, сарокі, гусі,

Качкі, чыбісы, саколкі,
Чаплі, совы, перапёлкі,

Каршуны, сіваваронкі,
Жаўранкі, шчыглы і слонкі,
Галкі, крумкачы, вароны,
Галубочкі нахахлёны,

Дзятлы, чыжыкі, зязюлі,
Кулікі, сяўцы, жаўнулі,
Шпакі, зяблікі, цяцеры,
Курапаткі пер’ем шэры,

Ластаўкі і верабейкі,
І сініцы, салавейкі,
Сойкі, пігліцы, удоды,
Што лятаюць без ахвоты.

Каля рэчак, на лужайках
Ёсць глушцы, стрыжы і чайкі,
І вядуцца на балотах
Жураўлі ў густых чаротах;

Па надворку, каля хаты,
Ходзяць куры й кураняты.
Хто сакоча, хто кудахча,
Хто па стрэхах спрытна скача,

Хто на кусціку ў садочку,
Хто на полі, хто ў лясочку,
Хто высока ў паднябессі
Моўчкі ўецца або з песняй:
Пачнуць хорам – не здзівіцца.
Ёсць дзе пець і весяліцца!

*Гульня ”Добра, дрэнна”.*

В.Дзеці, а як вы думаеце, гэта добра ці дрэнна, што птушкі адлятаюць ад нас?

Д.Добра.Зімою холадна ў нашых краях, ім няма дзе схавацца ад снегу і ветру, няма чаго есці.

В.А што дрэннага ў тым, што птушкі адлятаюць?

Д.Мы не чуем спеваў птушак, шмат птушак гіне па дарозе.

В.Так. Птушкі вярнуліся да нас, а хто з вас ведае, які клопат у птушак самы першы?

Д.Паправіць старыя гнёзды ці пабудаваць новыя.

В.З чаго будуюць гнёзды птушкі?

Д.З травінак, галінак, саломы, пер'я, бярозавай кары, лішайніка, гліны, імху, ваты. Унутры высцілаюць валаскамі, поўсцю, раслінным пухам.

В.Дзе будуюць свае гнёзды?

Д.На дрэвах, пад крышай, у кустах, у густой траве, у дупле, шчылінах будынкаў, нават у вулічных ліхтарах.

В.Вось гнёзды зробленыя і які цяпер клопат у птушак?

Д.Адкласці яечкі і вывесці птушанят.

В.А хто беражэ, саграваe іх?

Д.Мама-птушка.

В.А хто клапоціцца, корміць маму і птушанят?

Д.Дапамагае тата.

В.Малайцы!

В.А зараз мы з вамі пагуляем у гульню "Бусел і жабкі". З дапамогай лічылкі выбіраем бусла:
Хадзіў бусел па балоту,
Ён шукаў сабе работу,
Шукаў, шукаў, не знайшоў,
Ды заплакаў і пайшоў.

*Ход гульні:*

Усе дзеці – “жабкі” скачуць  пад музыку. Калі музыка сціхае, “жабкі” заміраюць. Выходзіць “бусел”, гаворыць і пільна назірае, каб забраць з сабою тую “жабку”, якая зварухнецца:

У чырвоных ботах
Ходзіць па балотах
Бусел доўганосы,
Жабак сабе носіць.
Тая «жабка», якая варухнецца, трапляе ў дзюбу “буслу” і выбывае з гульні.

Прыходзіць відэапісьмо ад Нязнайкі і яго сяброў.

В. Добры дзень! Паважаныя дзеці, дапамажыце! У Сонечным горадзе даўно не чуваць птушынных спеваў. Я і мае сябры баімся, што з птушкамі штосьці здарылася. І наогул мы хочам лепш пазнаёміцца з  пералетнымі птушкамі. Чакаем ад вас адказу”. Ну што, дапаможам Нязнайку?

В. Давайце пройдзем і сядзем за сталы. У вас на сталах ляжаць разрэзаныя выявы птушак. Вам трэба  з некалькіх частак  скласці птушку. А перад гэтым давайце зробім пальчыкавую гімнастыку ”Пералётныя птушкі”.

*Целе,целе,целе,целе- крыжуюць вялікія пальцы,махаюць далонямі;*
*З поўдня птушкі прыляцелі!*
*Прыляцеў шпачок-   па чарзе згінаюць пальцы на абедзвюх руках, пачынаючы з мезенца левай рукі;*
*Шэранькі бачок*
*Жаваранак, салавей,*
*Цапля, лебядзь, качка, трыж,*
*Бусел, ластаўка і чыж.*
*Усе вярнуліся,прыляцелі   -   зноў скрыжаваўшы вялікія пальцы махаюць далонькамі ;*
*Песні звонкія запелі!  -   паказальным і вялікім пальцамі робяць дзюбу.*

(Праца за сталамі)

В.Малайцы! Дзеці, а давайце  расскажам, у каго якая птушка атрымалася і што вы ведаеце пра гэтую птушку. Дзеці расказваюць аб сваёй птушцы.

Ластаўка - Гэта вясёлая, быстрокрылая птушка, якая цесна прывязаная да людзей. Гнязды гэтых птушак можна знайсці пад стрэхамі дамоў у гарадах і вёсках. Яны насякомаедныя і ловяць насякомых сваім шырокім носам. Усё жыццё гэтыя птушкі праводзяць у палёце. За лета адна птушка можа злавіць да

паўмільёна насякомых. Дзякуючы ім ёсць прымета - калі яны нізка лётаюць над зямлёй - чакай дажджу.

Буслы - гэта птушкі буйных памераў. Замест крыкаў бусел шчоўкае дзюбай. Белыя буслы таксама ўмеюць шыпець. Сваё гняздо бусел цалкам можа звіць на даху дома або на трубе. Калі бусел пабудаваў побач з домам гняздо, гэта лічыцца добрым знакам. Гэтых птушак людзі любяць.

Шпак -Калі у шпака няма хаткі, то пабудовай гнязда займаецца самка, самец дапамагае хіба што здабываць будаўнічы матэрыял;
Шпакі выдатна пераймаюць гукі прыроды, а калі птушка доўга жыве ў няволі, то можна навучыць і чалавечай гаворцы;
Шпакі даволі агрэсіўныя ў адносінах да іншых відаў птушак, у іх жорсткая канкурэнцыя за гнездзішчы;
На волі шпакі жывуць 10-12 гадоў;

Голуб - Птушка вельмі моцная. За гэтыя якасці іх вельмі шанавалі ў часы галубінай пошты. Галубы могуць развіваць хуткасць да 140 кіламетраў у гадзіну і могуць праляцець адлегласць да 3000 кіламетраў. Дзякуючы хуткасці гэтых птушак быў створаны галубіны спорт - гэта змаганне паштовых галубоў. Раз у два гады ладзяцца алімпіяды і конкурсы для гэтых птушак. Калі голуб п'е, ён уцягвае ў сябе ваду як праз саломінку, пры гэтым іншыя птушкі ў асноўным захопліваюць дзюбай некалькі кропель, а затым задзіраюць галаву, каб вада трапіла ў горла.

Журавы - Заўсёды служылі людзям сімвалам журбы па роднаму дому.
Журавы - Прыгожыя птушкі. Жывуць журавы ў вялікіх балотах . Птушкі гэтыя мерна крочаць, даволі глыбока заходзячы ў ваду, ўмеюць плаваць, высока і прыгожа лётаюць і часта параць, апісваючы шырокія кругі. Гэта разумныя, адважныя птушкі. Журавы вельмі таварыскія птушкі. Пара жураўлёў заўсёды вельмі адданыя адзін аднаму. Гэтыя птушкі у прыліве весялосці, выконваюць сапраўдныя танцы з падкідваннем каменьчыкаў і трэсак. Журавель - вельмі разумная птушка, перахітрыць яе складана. Зграя, напрыклад, заўсёды выстаўляе вартаўнікоў, якія ахоўваюць агульны супакой. Калі зграю хтосьці спудзіў, то перш чым вярнуцца на ранейшае месца, яна пускае наперад разведчыка. Журавы лёгка прыручаюцца і становяцца вельмі адданымі і вернымі сябрамі. Перад штогадовым восеньскім пералётам гэтыя птушкі збіраюцца ў пэўнай мясцовасці ў вялікія зграі, адкуль з гучнымі крыкамі здымаюцца і ляцяць без адпачынку днём і ноччу, пакуль не дасягнутае месца зімоўкі. Кожны раз яны ляцяць па адным і тым жа шляху і адхіляюцца ад яго толькі ў выпадку ўзнікнення небяспекі.

Дзяцел - Дзятла лёгка пазнаць па чырвонай шапачцы. Дзяцел лазіць па дрэве, чапляючыся за кару вострымі кіпцікамі і дапамагаючы сабе хвастом. У дзятла выдатны слых, ён чуе шамаценне насякомых пад карой і такім чынам знаходзіць іх. Знайшоўшы хворае дрэва, дзяцел пачынае ўзмоцнена дзяўбці кару, каб зрабіць у ёй адтуліну дастатковага памеру. Пасля гэтага ён дастае лічынак або жукоў сваім доўгім ліпкім языком. А язык ў яго сапраўды унікальны - ён расцягваецца да 20 сантыметраў у даўжыню . Параўнайце - сам стракаты дзяцел мае рост ад дзюбы да хваста 20-27 сантыметраў. Гэта значыць язык амаль памерам з яго!

В.Мы ўсе ведаем, чым птушачкі харчуюцца. А зараз нам трэба рассказаць Нязнайку, што нельга птушкам есці.
*Гульня "Што нельга даваць есці птушкам".*

В. А зараз мы дапаможам Незнайку падзяліць птушак на пералетных і зімуючых.

*Гульня "Зімуючыя і пералётныя".*
(Выстаўляецца дрэва зімовае і вясновае. Дзіця бярэ выяву птушкі і ляціць да свайго дрэва).

В.Малайцы, добра справіліся з заданнем. Дзеці, а дзе мы яшчэ можам убачыць і пачуць птушак?

Д. У лесе, парку, лузе.

В. А зараз я прапаную нам адправіцца ў лес. Я думаю, што ў лесе мы даведаемся яшчэ шмат цікавых звесткаў пра птушак для нашага сябра Нязнайкі. І хачу вам адкрыць адзін сакрэт: у лесе вас ужо даўно чакае Вясна з сваімі сябрамі птушачкамі!

В.А зараз апранаемся.
*Гульня-масаж:* з дапамогай імітацыі апранаем шкарпэткі, штаны, кофты, зашпіляем гузікі, абуваем боцікі, шапкі, курткі.

В.Гатовы? На чым адправімся ў лес?

Д.Пойдзем пешу, каб не турбаваць жыхароў лесу.

*Фізкультмінутка "Па дарозе ў лес":* крочым, перапрыгваем праз ручаёк, хадзьба па каменчыкам ,падлязанне пад галінкі.

В.Дзеці, а  зараз давайце спынімся і ўдыхнём паветра. Як вы думаеце, чым можа пахнуць ў лесе? Якое чыстае паветра, як тут легка дыхаецца!

Гучыць грамзапіс спеваў птушак, з'яўляецца Вясна.

Вясна.Вітаю вас, мае маленькія сябры! Мяне завуць Вясна. Я вельмі рада, што вы прыйшлі да мяне ў госці. Але  я хачу запытацца ў вас, ці ведаеце вы правілы паводін у лесе? Лес пакуль не хоча вас пускаць, ён баіцца за сваіх жыхароў. Калі вы адкажаце правільна на ўсе пытанні, лес адчыне свае дзверы (трансляцыя на тэлевізары, гульня ”Правілы паводзін”, лес прапускае дзяцей).

Вясна. Малайцы! А ці адгадаеце вы галасы маіх лясных сяброў? Гучыць грамзапіс ”Галасы птушак”.

Вясна. А ці хочаце вы даведацца,  пра што гавораць паміж сабою птушкі? (Вясна пераўтварае дзяцей у птушак).

*Інсцыніроўка верша ”Размова птушак”*

Шпак. Прывітанне птушцы невялікай!
Вітаю цябе, добрая сінічка!
Грак. Я дзятлу “добры дзень” ад сэрца шлю
Радзіму родную вітаю і люблю.
Дзяцел: Раскажыце, птушкі, дзе былі?
Сініца: Раскажыце, птушкі, што вы бачылі?
Шпак: У цёплым краі мы былі.
Там ні снегу, ні зімы.
Грак: Там па дрэвах уюцца ліяны,
На галінках какосы растуць,
Скачуць малпы, бананы жуюць.
Дзяцел: Як вы там жылі ўдалечыні ад дома?
І сябравалі з кім у краінах незнаемых?
Шпак: Па Беларусі роднай сумавалі
І па бурлівым ручайку,
Па дрэўцах, што нас гадавалі
І па суседу вараб'ю.
Сінічка: Каб сустрэча была цікавай
Мы станцуем разам з вамі!

*Танец ”Вясна”*
В.Дзеці, нам пара вяртацца. Нам трэба даць адказ Нязнайку.

Вясна: Да пабачэння, мае маленькія сябры! Вы сапраўдныя сябры птушак. А ў падарунак ад мяне прыміце гасцінцы.

Д.Дзякуй. Да пабачэння!

*Гучыць музыка.*

В.Ну вось мы з вамі і вярнуліся. Наталля Мар'янаўна здымала наш занятак і мы абавязкова адправім яго Нязнайку. А вы малайцы, былі сёння старannымі і ўважлівымі. Што вам спадабалася сення на занятку? Калі вам сёння было цікава, вазьміце выяву сонейка, а каму было цяжка, не зразумела - выяву хмаркі. Павярніцеся да гасцей і падыміце карткі. Малайцы!